Андрэй Вашкевіч
(Гродна)

Галасы з мінулага стагоддзя (перапіска заходнебеларускіх грамадскіх і культурных дзеячаў з Пятром Сяўруком)

Вясной 2005 года фонды Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея папоўніліся шэрагам новых цікавых экспанатаў. Жыхарка Гродна М. Францава перадала музею архіў свайго дзядзькі, заходнебеларускага філосафа, паэта і грамадскага дзеяча Пятра Якаўлевіча Сяўрука (1905-1929). Імя скідальчаніна Пятра Сяўрука стала вядома сучаснаму чытачу ў 1986 годзе, калі народны пісьменнік Беларусі Янка Брыль надрукаваў у часопісе „Полымя" яго вершы[1]. У наступныя гады пра Пятра Сяўрука і яго творчасць пісалі літаратуразнаўцы Аляксей Пяткевіч, Ала Нікіпорчык, Юрка Голуб, а вядомы беларускі даследчык і літаратар Уладзімір Калеснік нават адвёў П. Сяўруку некалькі старонак у зборы твораў заходнебеларускіх паэтаў і пісьменнікаў пад назвай „Ростані волі"[2]. Усе пералічаныя вышэй даследчыкі на працягу амаль двух дзесяцігоддзяў пісалі пра П. Сяўрука найперш як пра паэта, аднак увядзенне ў навуковы зварот дакументаў з асабістага архіва П. Сяўрука, які на працягу больш чым сямідзесяці гадоў рупліва перахоўвала сястра апошняга Марыя Мазалеўская, дало магчымасць зірнуць на яго асобу не толькі як літаратара, але і як грамадскага дзеяча — аднаго з арганізатараў дзейнасці Таварыства беларускай школы (ТБШ) у ваколіцах Гродна і самым горадзе ў другой палове 1920-х гг. Да стогадовага юбілею П. Сяўрука летам 2005 года некалькі артыкулаў аб ім было надрукавана ў беларускіх перыядычных выданнях, часопіс „ARCHE" размясціў на сваіх старонках тэкст аднаго з найбольш цікавых рукапісаў П. Сяўрука — зварот да беларускіх паслоў польска-

[1] Я. Брыль, *З рукапісаў, якія не гараць*, „Полымя", 1986, № 10.

[2] М. Сяўрук, *Што нагадаў фотаздымак?* [у:] *Памяць. Гродзенскі раён*, Мінск 1993, с. 86-87; *Яшчэ адно імя, яшчэ адзін талент*, [у:] *Памяць. Гродзенскі раён*, Мінск 1993, с. 100-101; А. Нікіпорчык, *„Мой прастор — гэта думкі палёт..."*, „Гродзенская праўда", 2000, 20 чэрвеня; Я. Брыль, *З рукапісаў, якія не гараць...*; *Ростані волі. З заходнебеларускай паэзіі*, Мінск 1990.

га Сейма, напісаны вясной 1929 г.[3] У падрыхтаванай да друку кнізе гродзенскага гісторыка Сяргея Токця зроблены дадатак, куды, апроч грунтоўнага біяграфічнага нарыса, уключаны вялікія ўрыўкі з дзённіка П. Сяўрука за 1921-1929 гг. і некалькі яго прац, якія тычацца беларускага нацыянальна-вызваленчага руху 1920-х гг. Ёсць надзея, што супольнымі намаганнямі гісторыкаў, літаратуразнаўцаў, музейных і архіўных супрацоўнікаў атрымаецца падрыхтаваць і надрукаваць асобную кнігу твораў П. Сяўрука, яго вершы, некаторыя філасофскія працы, артыкулы на грамадска-палітычныя тэмы і ліставанне.

На сённяшні дзень у фондах Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея захоўваецца 150 адзінак асноўнага і навукова-дапаможнага фондаў дакументаў і рукапісаў з архіва П. Сяўрука, рыхтуюцца да здачы ў фонды яшчэ некалькі дзесяткаў адзінак. Гэта перапіска П. Сяўрука, яго артыкулы і вершы на беларускай мове, проза і філасофскія працы. Асабліва унікальны экспанат — дзённікі, якія П. Сяўрук вёў з 1921 года амаль да самай сваёй смерці восенню 1929 года. Значную колькасць матэрыялаў з архіва П. Сяўрука можна знайсці ў музеі Максіма Багдановіча ў Гродне. Частка дакументаў, па ўсёй бачнасці, яшчэ знаходзіцца ў сваякоў і розных прыватных асоб.

Архіў П. Сяўрука унікальны не толькі яго ўласнымі творамі. Гэта бадай што адзіны дайшоўшы да нас амаль поўнасцю архіў лакальнай ячэйкі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху 1920-х гг., у дадзеным выпадку, скідальскага гуртка ТБШ. Пётр Сяўрук аказаўся як бы пасрэднікам паміж уплывовымі віленскімі дзеячамі нацыянальнага руху і асноўнай масай беларускага насельніцтва ў Скідалі і ваколіцах. Звычайна ролю такіх пасрэднікаў-рэтранслятараў беларускай нацыянальнай ідэі выконвалі выхаванцы яшчэ расійскіх настаўніцкіх семінарый, былыя народныя настаўнікі, якія і складалі аснову беларускай вясковай інтэлігенцыі. У выпадку Скідаля паміж Вільняй і гэтымі інтэлігентамі ў першым пакаленні ўзнікла яшчэ адно звяно — мысліцель-самавучка Пётр Сяўрук, які сваімі здольнасцямі і кругаглядам нічым не саступаў (а ў нечым і нават пераўзыходзіў іх) беларускім дзеячам з Вільні. Быў ён абсалютна аб'ектыўны ў адносінах да Савецкай Беларусі (і ролі камуністаў у заходнебеларускім нацыянальным руху) і мог выдатна арганізаваць лакальныя ячэйкі ТБШ у паасобных вёсках, звязаўшы іх паміж сабою агульнасцю задач і справаў. У адрозненні ад большасці народных настаўнікаў, якія прымалі ўдзел у беларускім нацыянальным руху змушаныя воляй пэўных абставін (цяжкія ўмовы жыцця

[3] П. Сяўрук, *Да „правадыроў" беларускага народу*, [у:] „ARCHE", 2005, № 4, с. 231-234; А. Вашкевіч, *Архіў, які не знік*, „Гродзенская праўда" 2005, 9 ліпеня; М. Дзелянкоўскі, *Душа баліць і рвецца*, „Народная Воля", 2005, 11 ліпеня; Ю. Голуб, *Не знала думка бездарожжа*, „Гродзенская праўда", 2005, 19 сакавіка.

пасля вяртання з бежанства, адсутнасць працы па спецыяльнасці, дыскрымінацыя з боку ўлад) Сяўрук быў, можна сказаць, перакананым, прафесійным грамадскім дзеячам. Пазней, у 1930-х гг., калі большасць актыўных удзельнікаў беларускага руху эпохі Грамады „адыйшла ад справаў", менавіта адсутнасць у вясковым беларускім грамадстве шырокай праслойкі такіх людзей як П. Сяўрук шмат у чым спрычынілася да аслаблення барацьбы беларусаў за ўласную дзяржаўнасць і захаванне нацыянальнай культуры.

Ніжэй чытачам „Беларускага гістарычнага зборніка — Białoruskich Zeszytów Historycznych" прапануецца перапіска П. Сяўрука з рознымі прадстаўнікамі заходнебеларускай палітычнай і навуковай грамадскасці: Антонам Луцкевічам, Людвікай Войцік (Зоськай Верас), Ігнатам Дварчаніным і інш. Лісты да П. Сяўрука паходзяць з фондаў Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, лісты самога Пятра Якаўлевіча Антону Луцкевічу і ў Беларускае выдавецкае таварыства выяўлены гісторыкам Алесем Пашкевічам у бібліятэцы Акадэміі навук Літвы ў Вільні. У перапісцы закранаюцца самыя розныя аспекты дзейнасці як самога Пятра Сяўрука, так і Гродзенскай Акружной управы ТБШ, якую апошні ўзначальваў на працягу большай часткі 1927 г. У лістах у Беларускае выдавецкае таварыства ў Вільні і А. Луцкевічу вясной 1924 года П. Сяўрук яшчэ толькі ўсталёўвае кантакты з віленскім беларускім асяроддзем, коратка расказвае гісторыю свайго жыцця, гаворыць аб сваіх філасофскіх поглядах, дзеліцца думкамі наконт артыкулаў, надрукаваных у знакамітым альманаху „Заходняя Беларусь". Праз тры гады Л. Войцік, Іван Савіцкі, І. Дварчанін ужо звяртаюцца да П. Сяўрука як уплывовага і аўтарытэтнага на Гродзеншчыне беларускага дзеяча.

Асаблівай увагі заслугоўваюць лісты і паштоўкі ад Ігната Дварчаніна. У іх апошні раскрывае сябе як чалавека добрага, надзвычай уважлівага да людзей, апантанага беларускай справай. У лістах і паштоўках Ігната Дварчаніна найбольш закранаецца адно пытанне, сутнасць якога была ва ўнутраным канфлікце Пятра Сяўрука, які ўжо летам 1927 г. пачаў падазраваць, што камуністы актыўна выкарыстоўваюць ТБШ дзеля сваіх палітычных мэт. П. Сяўрук не хацеў палітызацыі гэтай арганізацыі і, стоячы на чале Гродзенскай Акруговай Управы ТБШ, усяляк гэтаму працівіўся. У жніўні 1927 г. ён надрукаваў у паланафільскай газеце „Беларускі Дзень" артыкул пад назвай „Аб беларускай прэсе", дзе выказаў незадаволенасць бесперапыннымі сваркамі паміж беларусамі і адсутнасцю ў беларускіх арганізацыях пазітыўнай працы ў культурнай сферы. Артыкул быў сустрэты ў грамадоўскіх колах варожа, Сяўрука нават папрабавалі байкатаваць, аднак І. Дварчанін залагодзіў справу, разумеючы яго агромністую ролю ў дзейнасці ТБШ у ваколіцах Гродна. Праз два гады, у чэрвені 1929 г., літаральна за некалькі

месяцаў да смерці, П. Сяўрук паслаў у Галоўную ўправу ТБШ ліст, дзе паўтарыў свае прэтэнзіі да кіраўніцтва ТБШ і беларускіх паслоў Сейма ў больш разгорнутай форме. На гэты раз ліст П. Сяўрука застаўся без адказу. І. Дварчанін, у гэты час ужо ідэйны лідэр пасольскага клуба „Змаганьне" і сябра Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, зрабіў свой жыццёвы выбар. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў той час ужо амаль выключна разгортваўся пад уздзеяннем дырэктываў, што дыктаваліся з БССР. Ігнат Дварчанін быў адным з тых, каму суджана было праводзіць гэтыя дырэктывы ў жыццё...

У надрукаваных ніжэй лістах яшчэ толькі адчуваюцца водгукі трагедыі, што адбудзецца праз некалькі гадоў. Няхай гэтая публікацыя стане яшчэ адной цаглінкай у помнік усім іх аўтарам, беларусам Пятру Сяўруку, Антону Луцкевічу, Адольфу Зянюку, Мікалаю Марцінчыку, Васілю Сіткевічу, Людвіцы Войцік, Івану Савіцкаму і Ігнату Дварчаніну.

1. Ліст у Беларускае выдавецкае таварыства[4] ад 28 студзеня 1924 г.

Скідзяль 28 студзеня 1924 года.
У Беларускае Выдавецкае Таварыства.

Звяртаюся да Вас з сваею пякучаю патрэбаю збаўленьня. Ад Вас я атрымаў два гады назад першыя прамені прасьвету ў сваім цёмным кутку пад Польшчаю, цяпер звяртаюся да Вас, каб Вы далі мне сьвету больш. Прыкладаю тут „Уступ" да вялікага твору „Бо ёсьць". Гэты твор я пішу па-расейску, але пераклаў уступ па-беларуску. Ня ведаю, ці задаволіць Вас пераклад, не кажучы аб сэнсе твору. Я ведаю, што памылак орфографічных і памылак мовы будзе вельмі шмат. Але за гэта не абвінеця, бо гэты пераклад я зрабіў не прачытаўшы ніводнага радку беларускага правапіса, навучыўшыся першым адзнакам беларускае мовы чытаньнем беларускіх газэт здапамогаю аднаго „Маскоўска-беларускага слоўніка" Гарэцкіх. Апрача гэтага „слоўніка" да беларускіх газэт я амаль ніц ня чытаў, што вядома, вельмі мала дзеля азнакамленьня з беларускаю моваю. Але я ў гэтым не вінаваты. Я маю пякучае жаданьне як найлепей азнаёміцца з беларускаю літэратураю, асабліва з беларускімі народнымі творамі. Кожны народ наагул цікавіць мяне сваёю сфінксаваю загадкаю свае душы, якую я неразборліва разгадваць у творах народу. Гэтакую разгадку я яшчэ ў 921 гаду зрабіў над душою

[4] Беларускае выдавецкае таварыства — існавала ў Вільні ў 1913-1915, 1919 — пач. 1930-х гг., друкавала беларускую мастацкую літаратуру, пераклады на беларускую мову класікаў сусветнай літаратуры, календары, падручнікі, сярод іншых творы І. Дварчаніна, А. Луцкевіча, І. Канчэўскага.

расейцаў у сваім твору „Незаметный великан”. На жаль я пасьпеў толькі напісаць дзве часткі гэтага твору (I аб народзі, II аб прыказках) а трэцяй не пасьпеў зрабіць затым што хутка выехаў да Польшчы (III аб народным творстві) і тут ужо няма дзе ўзяць гэтага творства, каб растлумачыць яго. Але найбольш цікавяць мяне пытаньні, якія я выкладаю ў твору „Бо ёсьць”. Выкладаньне гэта даволі цяжка для маладога хлопца (мне цяпер 19 гадоў), атрымаўшага малую адукацыю (скончыў I год другое ступені ў савецкай школі) ды апрача гэтага без ніякае дапамогі добрых кніжак. Аднак я спраўляюся аднаею любасьцю да свае працы і пішу вельмі хутка, гэтак II разьдзел (крыху большы за уступ) напісаў бадай за 4 гадзіны 26 студзеня.

Я сказаў, што вучыўся беларускае мовы чытаньнем газэт, дык вось цяпер я ў гэткім становішчы, што нават газэты няма за што выпісаць. Шукаючы выхаду з гэтага становішча я ўздумаў ізноў зьвярнуцца да Вас. Найдзеця выдаўца дзеля майго твору, або іншых твораў, бо ёсьць у мяне і апаведаньні, або друкуйце самы ці па беларуску, ці па расейску. У першым выпадку (мяркуйце па перакладу) я або сам перакладу, або нехай хто перакладзе. Ці можа надрукуеце яго ў зборніку „Заходняя Беларусь”[5], у апошнім выпадку я прасіў бы ў лічбу ганарару прыслаць I зборнік, бо выпісаць ня маю магчымасьці. А калі не падыдзе да альманаху, дык у кожным выпадку можаце апублікаваць уступ у беларускае газэці у тым ці іншым сэнсі. Праз газету можаце і адказаць мне, каб не траціць коштаў.

Мой адрэс: miasto Skidel, pow. Grodzieński, Kolejowa, Piotr Siewruk.
У поўнай надзеі на Вас. Пётр Сяўрук.

Аўтограф Пятра Сяўрука, Аддзел рукапісаў бібліятэкі Акадэміі навук Літвы, фонд 21, справа 546, л. 3-3 зв.

2. Ліст Антону Луцкевічу ад 29 лютага 1924 г.

Skidel, ul. Kolejowa P. Grodzieńskiego. Piotr Siewruk
Пав[ажаны] Грам[адзянін] Луцкевіч!

Выбачайце мне за маю адвагу. Але вы хочаце ведаць хто я... Дык гэтак: Я малады селянскі хлопец 19 гадоў. Прайшоў курс навучаньня толькі I ступень савецкае школы, але найбольшае навучаньне я атрымоўваў ад свае уласнае смагі асьветы. Гэтая смага прымусіла мяне да

[5] „Заходняя Беларусь” — грамадска-палітычны, навуковы і мастацка-літаратурны альманах, выдадзены ў Вільні ў 1924 г. Беларускім выдавецкім таварыствам.

чытаньня. Я чытаў шмат... але вось ужо трэйці год як не чытаю ніц. І гэта мяне душыць, як пятля. Не магу жыць бяз кніжак, для гэтага шукаю розных спосабаў, каб дапяць свае мэты. Але ўсё дарма на ўсе мае лісты, якіе я пасылаю, не атрымоўваю адказу. Напэўна што не даходзяць, бо тутэйшые паштавікі мяне добра знаюць, дык ўсё, што пасылаю я да беларусаў напэўна ня пушчаюць. Нават на заказные пісьмы няма адказу, напр. ў „Змаганьне" ад 31/XII — 23. Каб як адсланіць загароду я прыдумаў паслаць ліст на прыватны адрэс, і ў гэтым імкненьні мне дапамагла Ваша абвестка. Дык Выбачайця!

Не гледзячы на тое, што няма кніжак, я не спыняю сваіх думак аб творстве. Ў апошні час напісаў твор „Потому что есть", Уступ якога паслаў ў Беларускае Выдавецкае Таварыства праз Беларускую Кнігарню. Але вось ужо месяц, а адказу няма. Дадаваемы тутакі кароценькі артыкульчык ёсьць толькі адна рыса да велікага твору, які я буду пачынаць „Человек і человечество" (Чатыры кніжкі). Гэты твор абыйме шмат новых паняцьцяў, кшталтам паняцьця аб нацыянальнасьці і патрыятызмі. Гэтые крытэрыі я разглядзеў тады, як стварaў X разьдзел ў „Потому что есть" — разьдел аб паняцьцях. Тады я ўбачыў, што ёсьць шмат недарэчных паняцьцяў. Дзеля гэтага думаю нават стварыць вялікі „Слоўнік паняцьцяў" або „Межы", ў якім зьмешчу паняцьці аб Богу, аб дабрэ, аб сіле, аб неабходнасьці, аб магчымасьці, аб прыгожасьці і шмат іншыя ў асьвятленьні сваяго крытычнага сьветапогляду.

Дык можаце сабе ўцяміць, якіе трудношчы трэба перамагчы, каб стварыць што добрае ня маючы кніжак. Ў асаблівасьці цікавіць мяне ў справе „Человека и человечества" артыкул ў „Нашым шляху" „Праз чалавечаства да беларускасці або праз беларускасьць да чалавецтва". Гэтак сама патрэбные народные творы. Але я ад Вас не вымагаю кніжак, я прашу аб іншам. Я прашу толькі пазнаімець мяне з беларускім грамадзянствам Вільні, дапамагчы мне выйсьці ў сьвет, каб выпусьціць у сьвет якую кніжку, дык гэтакім чынам атрымаць патрэбныя срэдствы дзеля куплі патрэбных кніжак. Прашу аддаць гэты кароткі артыкульчык у „Беларускі Голас".

Спадзеваюся на Вашу увагу. Чакаю ад Вас дапамогі... А калі не, дык мушу буду змагацца далей, купляць за апошніе грошы паперу, аддаваць іх на паштовые маркі і шукаць новых сьцежачак да выхаду, хоць толькі выпадак можа паказаць мне іх, падобна, які паказаў мне Ваш адрас. Дык заўважце, якіе гэтые траты, калі я нават ня маю кафтана на плечы. Толькі смага асьветы, смага ведаць праўду ня спыняе ў-ва мне імкненьня адчыніць сабе сьвет.

Буду чакаць ад Вас адказу. Адказаць можаце нават ў „Голасі Беларуса", бо беларускую газэту я атрымліваю так сама за апошніе грошы. Калі пажадаеце надашлю Вам свае творы ў расейскіх арыгіналах, бо

па беларуску я пішу слаба. Перакладаў гэты артыкульчык з дапамогай маскоўска-беларускага слоўніка. Калі гэты пераклад добры, дык магу пералажыць і вышайупомяненыя творы. Каб навучыцца па беларуску мушу мець іншыя падручнікі, а каб купіць іх ня маю грошы.

Дык дапамажыце... Або выбачайце за тое, што патурбаваў Вас.

29 лютага 1924 году. З пашанай П. Сеўрук.

Аўтограф Пятра Сяўрука, Аддзел рукапісаў бібліятэкі Акадэміі навук Літвы, фонд 21, справа 546, л. 9-9 зв.

3. Ліст ад Антона Луцкевіча ад 18 красавіка 1924 г.

Малады Таварышу!

Выбачайце, што так доўга не адпісваў на Вашае пісьмо: усё парашкаджала то хвароба, то работа, якой заўсёды лішне многа.

Прачытаў Вашу заметку аб мове і нацыянальнасьці. На жаль, ёсьць у ёй адна вялікая хіба: гэта — няправільнае прадстаўленьне аб паходжаньні нацыянальнасьцей і аб значэньні мовы. Віна гэтаму — недастатачнае веданьне гісторыі і гісторыі культуры.

Вось-жа зусім справядліва рвецеся да навукі: гэта — першая аснова публіцыстычнае працы, да якое відаць, маеце нахіл і некаторую здольнасьць.

Ведама, узьнімаецца пытаньне, якім-жа спосабам Вам здабываць гэту навуку? На гэта ў гэты момант нічога адказаць не здолею, але буду мець Вас у памяці, калі здарыцца магчымасьць даць Вам нейкую работу ў горадзе. Тут Вы прынамся будзеце мець кніжкі, якіх у вёску пасылаць немагчыма.

Пакуль-жа, загадаў выслаць Вам экзэмпляр „Заходняе Беларусі", у якой знойдзеце адказ на некаторыя пытаньні, што Вас цікавяць. Ахвотна адкажу Вам, калі будзеце мець нешта да мяне.

Шчыры прывет Ант[он] Луцкевіч.

Вільня, 18.IV.24.

Прыпіска рукой П. Сяўрука: „Атрымаў 26 красавіка 1924 года. Пётр Сяўрук."

Аўтограф Антона Луцкевіча, Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей (далей: ГДГАМ), КП — 85095/10

4. Ліст Антону Луцкевічу ад 29 красавіка 1924 г.

Паважаны Грам[адзянін] Луцкевіч!

Вялікую падзяку прыміце ад мяне за Ваш адказ і за ваш падарунак — кніжку „Заходняе Беларусі". Вашае імя застанецца сьвятым у маёй памяці. Вы першые пачулі мой голас, пачулі яго ў маленячкай і мала значнай заметцы. Вы адказалі мне, што я абмыляюся, я ў гэтым пераканаўся яшчэ перш, і вынікам гэтага зьявілася мая заметка „Псыхіка — голас, акцэнт — народ". Аднак ў артыкуле „народ і дзяржава" не найшоў адказу на пытаньне, што такое народ. Толькі гэты артыкул дапамог мне ўласнаю думкаю знайсьці адказ. І вось ён: Пачатак народу — ёсьць мова, якая творыць народу культуру. Культура ёсьць вышэйшы тып народу, дзеля гэтага, калі на адной мові творыцца дзьве культуры, дык у вышэйшым тыпе ёсьць ужо два народы. Гэтак сама, калі дзьве мовы маглі-б стварыць адну культуру, дык тады быў бы народ з дзьвумя мовамі ў вышэйшым тыпе, і два ў ніжэйшым.

Вы назвалі маю заметку творам, але гэта дзеля мяне не твор. Гэта лёт думкі, якая робіць колазварот, і кружыцца няўстанна. Яна абхоплівае рэч, дасць аб ім мне прадстаўленьне і імкнецца далей, навучаецца іншым рэчам, зварочвае да старое, злучае ўсе думкі і шукае праўдзівага і неразборліва. Гэткім чынам я і пераканаўся ў непраўдзівасьці свага ранейшага разуменьня мовы і нацыі.

Артыкул „Гэтым пераможаш!" найбольш аказаўся каштоўным дзеля мае думкі, я ў ім знайшоў шмат чаго не ведаў, а яшчэ больш, на падставах многіх думак артыкулу я зрабіў уласные доследы. На падставах шмат якіх думак я думаю напісаць „Чым жыве народ?" З гэтага артукулу я ў першы раз пазнаёміўся (вядома коратка) з Кантам, Фіхтэ, Лейбніцам, Гэгэлем, Марксам, Бэконам і інш. філёзофамі. Да гэтага часу я ведаў адну толькі велізарную думку славяніна Л. Талстога. У яго я навучыўся думаць, ад яго я пачаў думаць і думкі мае ляцяць колазваротам, тым колазваротам, які абхоплівае ўсё, адно адкідае, другое прызнае, трэцья імкнецца зьмяніць. У гэтай зьмене я асабліва заняты чалавечымі паняцьцямі адносна чалавека, ягонае істоты, духа праўды і многага іншага. Усе гэтыя зьмененыя паняцьці я імкнуся выкласьці ў „Слоўніку" („Межы, або Слоўнік паняцьцяў"). Я напісаў ужо два артыкулы да гэтага слоўніка, што раўняецца двум ці чатыром словам („Грунтоўнае паняцьце" і „Вера і бязвер'е"). Адзін з гэтых артыкулаў я падаю Вам. Разгледзьце лёт мае думкі, можа ўбачыце, што і беларус жыве так сама як немцы.

Калі Бэкон адшукаў тэорыю тэхнічнага дабрабыту ў барацьбе з морам, дык я — беларус — с контыненту, стаю за тэорыю маральнае „тэхнікі", якая павінна аднавіць сьвет, каб ня было ў ім зла. Бяз аднаўлень-

ня маралі праз „тэхнічнае” заваеваньне сваяго роду мы будзем вечна пакутаваць. Што дала „тэхніка” Бэкона. Эканомію? Заваяваньне прыроды? Не... Яна дала заваяваньне руіны, заваяваньне зьвярства. Я гэта сьмею сьцьвердзіць. Тысячу гадоў наперад Бэкона цэлая вайна не марнавала гэтулькі жалеза, гэтага добрага мэталу, і не губіла столькі жыцьцяў, колькі цяпер губіць і марнуе адзін зарад цяжкае батарэі.

І тэхнічнае заваяваньне, пачатак якому даў Бэкон, акурат у гэтым кірунку вельмі было пашырана на Беларусі нядаўна каля Х-гадоў і ізноў імкнецца ўзарвацца.

Дык вось я беларус ад вечнае мыслі Л. Талстого, паўстаю проціў гэтага руйнуючага зла і імкнуся даць ці знайсьці добрые паняцьці, добры грунт, праўдзівае імкненьне чалавечае волі, якая тэхніку ня пушчала-б у служэньне зьвярству, а толькі чалавецтву.

Дарэчы тут трэба зьвярнуць увагу на тое апраўданьне зла, якое дае Суліма[6] ў сваім артыкуле. Роль зла неяк містычна-догматычна разглядаецца ў гэтым артыкуле. Я не ведаю ці дазнаўся хто ці не аб тым, што знайшоў я ў самастойным кружэньні думкі.

„У зле няма ніякае неабходнасьці, бо зло ўсё руйнуе, але гэта ёсць спрацівам дабра. Як сказана ў Фізыцы: кожная сіла мае спраціў, дык якую ж роль адыграло зло ў прагрэсіі. Вось дзе сэнс мае думкі.

Калі чалавек ня ведаў дабра (якога ўсё роўна) дык усё ж ён быў чалавек. Дык вось зло пачало ўзьнікаць перад ім і ў барацьбе з злом чалавек змушаны быў шукаць дабра. Гэткім чынам зло выклікала дабро. А калі паўстала дабро, тады зло павінна зьнікнуць — стаць у значэньні звычайнага спраціву. Ці зьяўляецца цяпер зло спрацівам? Не. Яшчэ яно служыць таму, што прадаўжае выклікаць дабро. І калі гэта дабро пераважыць зло, тады зло будзе ў становішчы звычайнага спраціву.

Неяк нялоўка я тут выклаў думку, але пэўна зразумееце. Гэтая думка адчасьці і закранута ў маім творы „Бо ёсьць” (160 ст. гэткага сшыткавага фармату) на падставе гэтае думкі я пішу артыкул „Ад паходжаньні рэлігыі” і на падставе гэтае думкі я думаю напісаць „Слоўнік прагрэсу”, у якім каждае слова злого сэнсу будзе апісана ў ролі выключаючай праціўнае яму дабро.

Так сама яшчэ аб песьні Суліма ня дагаварыўся да яснасьці. На падставе ўласнае думкі, якую я знайшоў ужо два гады назад „Песьня — пачатак думаньня” я зразумеў, што гэта справядліва.

Але аб „радасьці” трэба пагаварыць больш. Я не ведаю у якім сэнсе ўжывае Суліма слова „радасьць”. Калі ў сэнсе расейскага блага дык было б так. Але гэта ня так. „Радасьць дапамагае росту чалавечае ду-

[6] Суліма, сапр. Уладзімір Самойла (1878-1941) — беларускі і рускі літаратурны крытык, філосаф. Супрацоўнічаў з „Нашай нівай”, аўтар філасофскага эсэ *Гэтым пераможаш!*, надрукаваным у альманаху „Заходняя Беларусь”.

шы, а сум яе забівае” кажа Суліма. Але гэта ня так. На жаль у беларусаў німа слова каб пералажыць яго на расейскае благо, а ўжываць гэтае благо немагчыма з прычыны таго, што гэтае слова ўжываецца ў нас наадварот. Благо ёсьць не радасьць (Гэтая думка ў творы маім „Бо ёсьць”). Сум аднолькава гэтулькі дапамагае росту чалавечае душы, як і іншая радасьць. Гэта я кажу сьмела. Бо сум (скорбь) столько-ж дае пачуцьця свае душы, як і радасьць калі ня больш. Толькі адчай забівае душу, так сама як і ідэотычная радасьць. Аб ёй пэўна ведае аўтар гэтага артыкулу здаецца яго ж артыкул „У сэнаторый д-ра Грабскага.”

Сум выклікае пачуцьцё душы, а пачуцьцё душы ёсьць пачуцьцё сілы, а пачуцьцё сілы ёсць тое, што па-расейску завецца благо. У гэтым німа сумніву, бо шляхам суму праходзіла чалавечая гісторыя, якая як мы бачым ня забівала а ўзрашчала душу. Гэтый-жа сум апанаваў нашу бацькаўшчыну толькі-ж ён ня губіць беларускіх душ. Аб гэтым добра ведае аўтар („Tryumfuje Białoruś”).

Яшчэ шмат чаго маю сказаць німа часу, німа мейсца, і не ведаю ці упадабаецца Вам. Да рэчы трэба ўспамянуць яшчэ, што датычыць адчаю.

Адчай забівае душу, і аўтар „Перамогі” ў значным ліку зьмясьціў артыкулаў у беларускае прэсе, якая ў пэўнае меры магла-б давясьці каго да адчаю, да халоднае радасьці, да зьдзеку над пакараным ворагам, да адчаянай радасьці. Наагул беларуская прэса дапамагае бадай адчаю. Я чытаў цэлы год газэту і вечна палітыка, вечна адны апісаньні адчаю, крыку, гвалту — што аж мароз пад шкуру бярэ. І вось аўтар, які ў значнай меры працаваў дзеля гэтага адчаю, дзеля суму усё-ж, кліча да радасьці. Якая-ж можа быць у нас радасьць? Не радасьць а расейскае благо ўзгадаўвае душу. А гэта благо як у разумнае радасьці так і цьвярдым суму. Толькі наша „туга” і „сум” неяк гучыць панура. Расейцы маюць больш урачыстые словы „скорбь”, „печаль”. Часткова гэты самы сум ёсьць у той паэзіі, якую Суліма лічыць пад’ёмам нацыянальнага духу. Гэты сум ёсьць нават пачатак паэзіі, якая зьяўляецца пачаткам думаньня. Першая пачатковая паэзія гэта ёсць тая самая гутарка, у якой словы гучаць сумна і задуменна (Караленка неразборліва). Як раз у гэтай паэзіі ўсё і сум, і задумленьне, і пачуцьце душы, ці пад’ём народнага духу. Нават у вышайшай паэзіі ўсяго гэтага ня знойдзецца ў гэтакім выразным абліччу.

Дык вось здаецца скарочаны колазварот думкі, якая хутка ў адзін дзень навярнулася, дзякуючы Вашаму падарунку. Вы адклікнуліся, хоць і праз 7 тыдняў. Я чакаў чакаў і ды перастаў чакаць, спадзяваючыся, што пісьмо нейдзі прапала. Я забыўся, што ёсьць людзі якім шмат, за лішня, работы, — а я дык вось і марнею так сабе. Сколькі я не думаў, сколькі не думаю, сколькі ўсяго напісаў у кароткі час сваяго думаньня але ўсё нікому невядома. Асабліва значны твор па багацьцю думкі „Бо

ёсьць”. Пісаны па расейску. Я ўсё пішу па расейску, бо лепш уладаю гэтаю мовай і ў ёй большае багацьце словаў. Гэтак напр. у нашай, так сама даволі багатай мове німа адпаведнага дзеля расейскага благо. Ды і наагул я добра ня уладаю беларускаю мовай.

Дык вось: дзякуючы Вашай ахвоце адказваць мне я ў Вас прашу адказаць: ці не знойдзецца якое расейскае выдавецтва, каб магло выдаць мае творы, хоць тое „Бо ёсьць.” Можа я залішне вялікую сьмеласць дапушчаю сабе, у такім выпадку выбачайце. Не ведаю, мо я іду нават супроць перакананьняў, — але я ня магу цярпець. Адносна Вашага прапанаваньня дастаць мне працу ў горадзі ня магу Вас запэўніць. У мяне німа пашпарта, а Вы ведаеце, якая цяжкая справа пашпарт. У кожным выпадку ніц аканчальна ня ведаю. Яшчэ раз выбачайце і яшчэ раз дзякую за Ваш ліст і Вашу кніжку. Выбачайце, я прасіў-бы і адказу хутчэй, бо надта цяжка чакаць у невядомасьці.

Выбачайце і дзякуй.

З шчырай Пашанай.

Скідзяль 29 красавіка Пётр Сяўрук.

Аўтограф Пятра Сяўрука, Аддзел рукапісаў бібліятэкі Акадэміі навук Літвы, фонд 21, справа 546, л. 14-16 зв.

5. Ліст ад Адольфа Зянюка[7] ад 4 траўня 1925 г.

Вільня, 10.V.25.

Паважаны Грамадзянін.

Усе В[ашы] лісты і матэрыялы да Студэнцкае Думкі[8] Рэдакцыя атрымала, аб чым паведамляем Вас цераз Крыніцу[9], у аддзеле карэспандэнцыі.

Мой ліст да Вас яшчэ з 1924 г. быў вызваны дзеля вось якіх прычын: у эскізе, друкаваным у № 1 „С[тудэнцкае] Д[умкі]” рэдакцыя ўбачыла думку, зьверненую ў бок соцыяльных разважаньняў, прычым матэрыял да гэтае думкі пачарпнулі Вы з адвечнае крыніцы клясавых „непаразу-

[7] Адольф Зянюк (1894-1938) — беларускі дезяч з Сакольшчыны, адзін са стваральнікаў Гродзенскага гуртка беларускай моладзі, адвакат, рэдактар часопіса „Студэнцкая думка”.

[8] „Студэнцкая думка” — грамадска-палітычны, навуковы і літаратурны орган Беларускага студэнцкага саюза. Выдаваўся з перапынкамі ў 1924-1931 гг. У № 1 часопіса было надрукавана апавяданне П. Сяўрука *Гісторыя аднае сьмерці*.

[9] „Крыніца” („Беларуская Крыніца”) — беларуская грамадска-палітычная газета, орган Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, выходзіла ў 1917-1937, 1939-1940 гг.

меньняў” у ўкладзе сучаснасьці, даючы чытачу заданьне разважаць, увайсьці ў прычыны апісыванага здарэньня і задумацца над афармляным „правам” укладам сёньняшніх дзён. Другое, што ў гэтым-жа эскізе коратка, характэра і прыгожа наштрыхаваны быў „эпізод” з жыцьця, ці ляпей сьмерці. Убачылі мы тое, чаго ў нашай літаратуры, асабліва ў празаікаў — а іх на жаль так мала у нас — спатыкаемо рэдка: гэта мастацтва.

Як Вы ужо пэўне прыкмецілі „Ст[удэнцкая] Думка” мелася выходзіць на 3-х лістох, але нехват грошай і малая ўвага падпісчыкаў, ляпей ізноў нехват іх змусілі агранічыцца да 2-х лістоў. Вось прычына, чаму болей нічога Вашага ня зьмесьцілі. Пры тым ня ўсё да студэнцкае часопісі падходзіла — апошні апокрых да гісторыі саўсім бы надаўся, але ня маем пэўнасьці, ці стане нам сілы выдаць якіх неразборліва.

Цяпер, вяртаючыся да Вас, як беларускага працаўніка, ад імяні рэдакцыі прашу Вас і раджу працаваці над сабою, бо талент у Вашых словах відаць. Трэба толькі дзьвух рэчаў: 1) пазнаньня грунтоўнага беларускае мовы і літэратуры і 2) учытвацца ў сусьветную літаратуру, дзе пачэрпнеце шматлікія прыклады і разшырыце свой літэрацкі кругазор. Мы як студэнты, занятыя асабліва цяпер работаю, дый людзі з малым жыцьцёвым досьледам, мо не надаемся на літэрацкіх кіраўнікоў Вас, а вось становішча „рэдактара” кажэць напісаць Вам гэтыя словы. Раіў бы ад сябе зьвярнуцца з лепшымі Вашымі творамі да грам[адзяніна] Антона Луцкевіча з просьбай, каб ён даў сваю ацэнку і параду, гэта найлепшы наш крытык, а мо й стыліст.

Усё-ж ня помніце нас ліхам, а калі з восені мы йзноў прыймемся за выдавецтва, ня трацьце з намі кантакту.

З пашанай Адольф Зянюк.

Аўтограф Адольфа Зянюка, ГДГАМ, КП — 85095/13

6. Ліст ад Мікалая Марцінчыка[10] ад 4 верасня 1926 г.

Грам[адзянін] Сеўрук!

Пісьмо, дэклярацыі і сяброўскія складкі ад Вас атрымалі і высылаем Вам сяброўскія білеты, паведамленьне і статут старосце.

Вы пішаце, што ў Вас некаторыя не могуць уступіць у Т[аварыст]ва з прычыны сяброўскіх складак; хай гэта не будзе ім перашкодай, гурток хай напіша нам, што такія-то і такія то маламожныя і ня могуць плаціць 50 гр. і Галоўная Управа пастараецца зьменьшыць складку або нават зусім звольніць.

[10] Мікалай Марцінчык (1901-1980) — беларускі дзеяч, лекар, старшыня Беларускага студэнцкага саюза, з 1934 г. намеснік старшыні галоўнай управы ТБШ.

Сяброўскія білеты выдае толькі Галоўная Управа.

Т[аварыст]ва Беларускае Школы для нова адчыніўшайся бібліятэкі дае толькі беларускія кніжкі на льготных варунках, — другія — расейскія і польскія — нават каб і хацела даць, то ня мае іх. За кніжкі трэйцюю частку грошай трэба ўнясьці адразу а дзве трэйція — у працягу году.

На публічныя рэфэраты, як Вы самы пішаце, — трэба дазвол. А вось як Вы зарганізуеце гурток свой і будзеце мець ад нас пасьведчаньне, што Вас зацьвердзіла Галоўная Управа, то тады Вы, будучы залегалізованым гуртком можаце для сваіх сяброў чытаць лекцыі на тэмы культурна-асьветныя, літэратурныя, аб мастацтве і іншым без дазволу і нават без паведамленьня, але ляпей на ўсялякі выпадак паведаміць паліцыю.

4.IX.26 г.
Сэкрэтар М. Марцінчык.
Ліст зацверджаны пячаткай Галоўнай Управы ТБШ у Вільні

Аўтограф Мікалая Марцінчыка, ГДГАМ, КП — 85095/17

7. Ліст ад Людвікі Войцік (Зоські Верас)[11] ад 6 красавіка 1927 г.

Вільня 6-га красавіка
1927.
Паважаны Грамадзянін.

Падпіску на „Заранку”[12] ад Вас атрымала. Не памятаючы, ці 1-шы нумар — „пробны”, быў Вам высланы ці не, пасылаю яго.

Чула я шмат аб Вашым заінтэрэсаваньні справай дзіцячай асьветы і дзеля гэтага пастанавіла зьвярнуцца да Вас з просьбай быць супрацоўнікам „Заранкі” — прысылаць для друку ў ёй адпаведныя матэр’ялы і апроч таго заахвочваць Вашых знаёмых дзяцей, каб прысылалі разгадкі „круцігаловак” і задач, зьвярталіся з рознымі пытаньнямі, каб даць пачатак шырокай перапісцы „Заранкі” з яе чытачамі, ды прысылалі свае працы: запісаныя казкі, прыпеўкі, ды дзіцячыя сьмяхотныя песьні, дзеля друкаваньня іх у аддзеле: „Працы нашых чытачоў”.

Такім чынам навяжэцца цесны і моцны кантакт паміж рэдакцыяй „Заранкі” і нашымі дзяцьмі, пры якім змагу працаваць у пэўным, самымі дзяцьмі і іх духовымі патрэбамі, намечаным напрамку; і такім чынам паставіць „Заранку” на патрэбную вышыню. Маю вялікую надзею знайсьці ў Вашай асобе рупнага і спагадлівага супрацоўніка якіх мне вельмі, вельмі нехапае.

[11] Людвіка Войцік, дзявочае Сівіцкая (1892-1991) — беларуская пісьменніца, грамадска-культурная дзяячка, друкавалася пад псеўданімам Зоська Верас.

[12] „Заранка” — ілюстраваны часопіс для дзяцей, выдаваўся ў Вільні ў 1927-1931 гг.

Адказу чакаю з нецярплівасьцю.
З пашанай рэдактарка Л. Войцікава.
Калі ласка пішэце на адрас Вільня. Віленская 12-6.
рэд. „Заранкі”

Прыпіска рукой П. Сяўрука: „7.IV.27. Пётр Сяўрук”.

Аўтограф Людвікі Войцік, ГДГАМ, КП — 85095/8

8. Ліст ад Людвікі Войцік (Зоські Верас) ад 17 ліпеня 1927 г.

13/VII. 27 г.
Паважаны Грамадзянін.
Зьвяртаюся да Вас, як да прыхільніка „Заранкі”. Ужо даўны пасол Баран[13], узяў у мяне 100 экз. „Заранкі” і, як кажа, даў нейкаму вучыцялю прадаваць. Гэта ўжо месяцы са тры цягнецца. Тымчасам цяпер „Заранка” апынулася ў гэтакім палажэньні, што ёй кожны грош шмат значыць. Аддадзена ў друк 5-6-я кніжка, а выкупіць нізашто, а надалей мо і зусім перастане выхад. Я ўсю віну прыпісваю Т[аварыст]ву Беларускай Школы, бо ні Галоўная Управа ні Акружныя не дбаюць, каб гурткі „Заранку” выпісвалі ў свае бібліятэкі. Такую маленькую падпіску, як 1 залатоўка на квартал кожны Гурток змог-бы прыслаць. З Галоўнай Управай мне ужо гаварыць надаела. Да другіх Акружн[ых] Упр[аў] не зьвяртаюся, бо не знаю якія там людзі сядзяць, ці адклікнуцца на маю просьбу; а ўся надзея на Вас, як на чалавека маладога, значыцца энэргічнага і рупнага. Думаю, што Вы, карыстаючыся сваім палажэньнем старшыні Управы захочаце пастарацца, каб усе Гурткі Вашай акругі „Заранку” выпісалі і прыслалі падпіску; а таксама каб стараліся здабыць нам падпішчыкаў сярод школьных дзяцей. Апроч таго будзьце ласкавы даведайцеся які там вучыцель „Заранку” прадае і папрасіце каб атрыманыя грошы неадкладна мне выслаў. Не шмат там гэтага будзе алеж і крышка не пашкодзіць, а паможа. Маю вялікую надзею, што зьвернеце увагу на маю просьбу і пастараецеся яе выпаўніць. Чакаю хуткага адказу.
З пашанай Л. Войцікава
рэдактарка „Заранкі”.
Вільня
Віленская 12-6.

Аўтограф Людвікі Войцік, ГДГАМ, КП — 85095/9

[13] Сяргей Баран (1892 — пасля 1935) — беларускі грамадскі дзеяч, старшыня Гродзенскага беларускага нацыянальнага камітэта, пасол Сейма Польшчы, у 1923 г. асуджаны польскім судом за антыўрадавую дзейнасць. Пасля выхаду з польскай турмы хутка выехаў у БССР, дзе быў асуджаны і памёр у лагерах.

9. Ліст ад Васіля Сіткевіча[14] ад 30 мая 1927 г.

Паважаны гр[амадзянін] Сеўрук!

Пры гэтым пасылаю Вам заяву аб дазвол на спэктакль і п'есу для адцэнзурованьня. Прашу асабліво прылажыць усе стараньні і дастаці нам дазвол, бо сябры сьпяць цяжкім сном, трэ іх зварушыць, інaчэ ані працаваць адзінкам няможно, ані сяброўскіх складкаў сцягнуць, так цяпер патрэбных. Ведаеце нават адчота даць па гэтым пытаньням цяпер няможам. Пачтоўку Вашу, ад 25.V., я атрымаў. Дзякую! Дазвол на спэктакль у в[ёсцы] Княжеводцах (аб яком Вы пішаце) дастаньце на 19.VI.27. Будзем Вам удзячны. Ехаць да Горадні асабіста пакуль немаям магчымасьці, бо німаем грошаў.

З пашанай В. Сіткевіч.

30.V.27 г.

P.S. Дазвол перашліце поштаю альбо мы прышлем 7.VI. да Скідля чалавека.

Аўтограф Васіля Сіткевіча, ГДГАМ, КП — 85095/11

10. Ліст ад Васіля Сіткевіча ад 26 чэрвеня 1927 г.

Вел[ьмі] Пав[ажаны] Грам[адзянін] Сеўрук!

Найперш выражаю Вам падзяку за тыя турботы, якія Вы мелі з атрыманьнем нам з Староства дазволу на спэктаклі. Аля я ізноў зьвятраюся з такою просьбаю, як калісьці і маю надзею, што ні адкажаце нам. 24.VI.27 намі пасланы палецоным пісьмом да Акружное Управы аж дзве паперкі на дазволы на спектаклі. На 3.VII. у в[ёсцы] Запольле хочам паставіць „Ня розумам сьцяміў, а сэрцам" а на 10.VII. і 12.VII. „Пан Міністар". З дазволам на першую п'еску думаю будзе лягчэй, але з другою цяжэй, бо ніведамо ці яна цэнзурована, а на адцэнзурованьне мы кніжкі не паслалі, дык прашу Вас хоць часово ўзяць дзе ў Горадні кніжкі[15]. Калі б што вельмі мешалоб атрыманьню дазволу на другую (п'еску) камэдыю, дык пастарайцеся дастаць хоць на першую, і, калі ня-

[14] Васіль Сіткевіч (1896-1970) — беларускі настаўнік са Скідальшчыны, найбліжэйшы паплечнік Пятра Сяўрука, удзельнік Скідальскага паўстання 1939 г. Падрабязна пра В. Сіткевіча гл.: С. Токць, *Лёс беларускага настаўніка*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2004, № 21, s. 207-217.

[15] Староства давала дазвол на спектаклі, якія былі адцэнзураваныя паліцыяй, г.зн. на рукапісе п'есы або яе друкаваным выданні стаяла спецыяльная пячатка і подпіс адказнай службовай асобы.

можна на ўказаны тэрмін, то можаце змяніць яго на 7, 10 альбо 12 ліпня. Мімаходам скажу пару слоў пра прошлы спэктакль. Глядзельнікаў было так многа, што аж лаўкі паламалі, нігледзячы, што многае перашкаджала. Выручано 26 зл., расходавано 15,75 зл. Білеты да 10 гр. Яшчэ мімаходам скажу, што быў у мяне вядомы Вам Луневіч[16] аб якім, думаю, калі нібудзь, пры аказіі, пагаворым.

З пашанаю В. Сіткевіч

26.VI.27.

Аўтограф Васіля Сіткевіча, ГДГАМ, КП — 85095/12

11. Ліст ад Івана Савіцкага[17] ад 22 верасня 1927 г.

Таварыства Беларускае
ШКОЛЫ
ГАЛОЎНАЯ УПРАВА
Дня 22 верасьня 1927
№ 1606
Вільня, Сьв. Анны № 2-3.

Грамадзяніну СЕЎРУКУ Пятру,
м. Скідэль, Горадзенскага павету.

Адчыніць прыватную школу ў гэтым годзе немагчыма дзеля таго, што ўпушчаны срок (I ліпня). Калі сёлета ў ВАС не адчыніцца ўрадовая школа, то напружце ўсе сілы і злажэце ячшэ болей дэклярацый, але зьвярніце асаблівую ўвагу на точнае выпаўненьне ўсіх фармальнасьцяў запаўненьня і складаньня ў срок дэклярацыяў, а таксама сьцьвярджэньня подпісаў бацькоў, каб ня было поваду адмовіць у адчыненьні школы. Ня трэба толькі адчаівацца. У гэтым вытрывалым змаганьні за родную школу выкоўваецца загартаваная воля нашага народу. Працуйце, грамадзянін, і другіх заахвочвайце. Ні адзін высілак не прападзе дарма!

ВІЦЭ-СТАРШЫНЯ І. Савіцкі

Машынапіс на бланку з пячаткай Галоўнай Управы ТБШ, подпіс Івана Савцікага, ГДГАМ, КП — 85095/14

[16] Луневіч — адзін з беларускіх актывістаў з-пад Скідаля, паплечнік Пятра Сўрука, згадваецца ў дзённіках апошняга.

[17] Іван Савіцкі — беларускі настаўнік і грамадскі дзеяч.

12. Ліст ад Івана Савіцкага ад 30 лістапада 1927 г.

Таварыства Беларускае
ШКОЛЫ
ГАЛОЎНАЯ УПРАВА
Дня 30 лістапада 1927
№ 1941
Вільня, Сьв. Анны № 2-3.
Грамадзяніну СЕЎРУКУ Пятру,
м. Скідэль, Горадзенскага павету.

Пасылаецца Вам 10 штук календароў-кніжак па I зл. за экзэмпляр, разам на суму 10 злотаў. Гэтыя грошы Вы павінны зараз-жа выслаць у Галоўную Управу. Скідка, належачая Вам з гэтых календароў, залічана на перасылку.

ВІЦЭ-СТАРШЫНЯ І. Савіцкі
Сэкрэтар Н. Калядзянка[18]

Машынапіс на бланку з пячаткай Галоўнай Управы ТБШ, подпісы І. Савцікага і Н. Калядзянкі, ГДГАМ, КП — 85095/15

13. Ліст ад Ігната Дварчаніна (лета 1927 г.)

Паважаны грамадзянін Сяўрук!

Карыстаюся фактам адпісваньня ліста с[падару] Васільку[19], каб чырканутць і Вам пару слоў. Вы, вядома, не пакрыўдзіцеся, што не пішу асобна. Проста — выгадней.

Здаецца справы з Управай будуць зусім залагоджаны. Сягоньня яшчэ дастаў ліст з Управы аб тым, што памяшчэньне знойдзена. Справу залагодзіў.

Мне да Вас наагул хочацца напісаць. Ведаеце — ад Вашага такту ў Управе будзе залежаць уся справа. Як я змог пераканацца, Вы запраўды зьяўляецеся старшынёй, на якім усё апіраецца. Што да хлопцаў, то яны таксама, трэба прызнаць, добрыя і слаўныя. Будзьце да іх трошкі выбачлівейшымі. Проста — будзьце тактоўнымі і разумнымі. Ня трэба завострываць канфліктаў. Лепей усё залагодзіць мірна, а гэта ад Вас, як чалавека разумнага, безумоўна залежыць. Я быў калісьці вучыцелем і ведаю, што добрымі, лагоднымі мерамі заўсёды дасягнеш леп-

[18] Н. Калядзянка (магчыма Калядзячка) — біяграфічныя звесткі адсутнічаюць.
[19] Міхась Васілёк, сапр. Міхал Касцевіч (1905-1960) — заходнебеларускі паэт, грамадскі і культурны дзеяч, сябра і зямляк П. Сяўрука.

шых вынікаў. Гэта мера не абманвае мяне, калі я і перастаў быць вучыцелем. Не забываюся прапанаваць яе і іншым. Думаю, што Вы разумееце мяне і пастараецеся зрабіць усё, як належыць. Буду вельмі ўсьцешаны, калі Вы дагаворыцеся працаваць разам з іншымі сябрамі і паставіце справу так, каб Управа была на належнай вышыні. Трэба проста любіць людзей якімі яны ёсьць і адносіцца да ўсіх з выбачэньнем. Пэўна, што Вы паправіце свае адносіны.

Цяпер адносна Вашага пісаньня. Брашура аб гарэлцы не можа быць пакуль што надрукавана, але ў календар карткі пойдуць амаль усе. Прысылайце больш матар'ялу да абодвух календароў.

А пакуль — бывайце.

З пашанай І. Дварчанін.

Знізу прыпіска рукой М. Касьцевіча (М. Васілька): „Дарагі Пётра! Выконваю прозьбу Дварчаніна, перасылаю табе гэты ліст. М. Косьцевіч.

P.S. Вельмі ужо ён з вялікай пашанотай успаміная ў маім пісьме аб Вас, — сустрэнемся — пакажу".

Аўтограф Ігната Дварчаніна, ГДГАМ, КП — 85095/6

14. Ліст ад Ігната Дварчаніна ад 5 ліпеня 1927 г.

Вільня, 5.VII.27 г.

Паважаны Грамадзянін!

З прыемнасьцю прачытаў Ваш ліст, пісаны разам з Васільком бо, трэба сказаць, што ён вельмі на часе. Вашы думкі, што да сутнасьці і зьместу календара вельмі слушныя і, як на дзіва, сходзяцца з думкамі ўсіх заінтэрэсованых у гэтай справе, прыватна, з маімі думкамі, якім я ўжо даў належны ход. Не згаджаюся толькі з крытыкай папярэдніх календароў, бо запраўды яны такое крытыкі не заслугоўваюць. Кожная эпоха (і наагул — час) родзіць сваяродную продукцыю, як праяву ідэалёгіі на кніжным рынку. Нашы календары дасюль гэта выпаўнялі ў поўнай меры, заслугоўваючы зусім справядлівую нагароду на спецыяльных выстаўках. Калі ў Вас зьявіліся цяпер думкі, нязгодныя з праводжанымі ў ранейшых календарах і наскольки гэтыя думкі сустрэліся з падобнымі ў другім асяродку — гэта пэўны знак, што гэтыя думкі цяпер на часе. Слушныя Вашы ўвагі ў драбніцах трэба аднясьці на рахунак зьбіральніка календара (аўтараў), якія відаць ня мелі часу акуратна усё даглядзець, бо трэба адрозніваць справу аўтарства і выдавецтва. Выдавецтва пускае ў ход ужо гатовы матар'ял, які зьбіраецца аўтарам. Але даволі аб гэтым. Будзем рабіць календар. Вашу прапазыцыю аб супрацоўніцтве вітаю, ведаючы Вас, як чалавека, заслугоўваю-

чага найлепшай пашаны.

Аўтарам будучых (1928) календароў (абодвых) маю быць я. І пачата ўжо арганізацыя працы. Таму прашу Вас вельмі — надаслаць усе матар'ялы, а таксама практычныя ўвагі, як да аднаго, гэтак і да другога календара ў тэрмін як найхутчэйшы, бо справу трэба лічыць ужо сьпешнай. Нават нічога, калі ў Вас што небудзь не гатова. Гэта дапоўніце пасьля. Мне важна ведаць і мець пад рукой Вашых матар'ялаў, каб гэтага самага не даваць рабіць іншаму і каб для Вас асабіста акрэсьліць сьцісьлей разьмер і галіну працы. Мушу падкрэсьліць, што гаспадарчы аддзел ужо гатовы, а таму яго можна не чапаць. Вельмі будзе цікава мець Вашы ўвагі, таму прашу не марудзіць.

За матар'ял, які будзе Вамі напісаны і які пойдзе ў календары, дастанеце некаторую плату.

Калі пішаце што да календара адрыўнога, то мяркуйце, каб улезла ўсё на адным лісціку. Але аб гэтым усім я напішу, калі дастану ад Вас матар'ял. Дык чакаю хуткага адказу.

З пашанай І. Дварчанін.

Аўтограф Ігната Дварчаніна, ГДГАМ, КП — 85095/7

15. Паштоўка ад Ігната Дварчаніна ад 13 ліпеня 1927 г.

Вільня, 13.VII. 1927 г.

Паважаны Сябру! Ліст Ваш з матар'яламі дастаў. Дзякую. Аб усім будзем мець магчымасць пагаварыць асабіста, калі я прыеду да Вас каля 24.VII. Справа ў тым, што Гал[оўная] Управа мае дэлегаваць мяне на сход Вашае Акр[ужное] Управы. Пастараюся прыехаць да Вас за 1-2 дні раней.

Пакуль жадаю ўсяго лепшага.

З пашанай І. Дварчанін.

Аўтограф Ігната Дварчаніна, ГДГАМ, КП — 85095/2

16. Паштоўка ад Ігната Дварчаніна ад 12 жніўня 1927 г.

Радашковічы, 12.VIII.1927 г.

Паважаны Сябру! Прыехаўшы з Радашкавіч, дзе я знаходзіўся на курсах, у Вільню, я быў сустрэчаны цэлаю хмараю пытаньняў, ці гэта Вы пісалі артыкул у „Бел[арускія] Дні". Калі так — мусіце гэта кінуць, а то Вас зусім перастануць паважаць за чалавека. Што гэта Вам уздумалася. Зусім дрэнь. Пішэце мне аб матывах, якія вынудзілі Вас туды пісаць.

Матэр'ялы Вашы да календара дастаў. Пакуль не напішаце аб Ва-

шым вучасьці ў „Бел[арускія] Дні” не хачу разглядаць Вашых матэр’ялаў. Спадзяюся, што Вы мне напішаце. Пішэце на Вільню, бо хутка там буду.

З пашанай І. Дварчанін.

Аўтограф Ігната Дварчаніна, ГДГАМ, КП — 85095/3

17. Паштоўка ад Ігната Дварчаніна ад 14 кастрычніка 1927 г.

Вільня, 14.X.1927 г.

Даражэнькі Сябру! Магчыма Вы палічыце неспадзяванкай з розных бакоў гэтую адкрытку. Але мусім усё гэта адкінуць — усё ўжо прайшло. Ня прымеце маё маўчаньне за варожасьць — усё гэта ўжо ня так важна. Ня буду нават адказваць па сутнасьці Вашых лістоў — ня маю зусім часу. Цяпер я завалены працай у Гімназіі а да тога — і старая ўся ляжыць на маіх плячох. Ня крыўдзіцеся, што ня пісаў, ня пісаў я ня толькі Вам — тры месяцы ня пісаў братам да дому і ў Чэхію, ня пісаў нават такім інстытуцыям, як аддзел Лацьвійскага Міністэрства, які да мяне зьвярнуўся — ня маю сіл.

Гэтаю адкрыткаю хачу толькі паведаміць, што да Вас абсалютна нічога дрэннага ня маю. Прашу выбачэньня, што сваім маўчаньнем зрабіў Вам напэўна кепска, даў магчымасць многа аб чым перадумаць. Сябру! Залагоджвайце справу самі, або праз Т[аварыст]ва а то я ня маю ніякай фізычнай магчымасці што небудзь рабіць — так заняты. Вельмі шмат працы. У выпадках надзвычайных заўсёды прыду на дапамогу. Календар я здаў у другія рукі. Вашы паперы перад вобыскам былі зьнішчаны. Цяжка цяпер у Вільні. Бывайце. Прывет Васільку.

І. Дварчанін.

Аўтограф Ігната Дварчаніна, ГДГАМ, КП — 85095/4

18. Паштоўка ад Ігната Дварчаніна, 20 кастрычніка 1927 г.

Вільня, 20.X.1927 г.

Паважаны Сябру! Перасылаю пры гэтым Вашу рукапіс, згодна з пажаданьнем, выказаным Вамі ў вапошнім лісьце.

Яшчэ раз прашу не сердаваць на мяне за няўважлівае адношаньне да Вашых лістоў. Гэта склалася толькі дзякуючы браку часу.

Астаюся з пашанай.

І. Дварчанін.

Аўтограф Ігната Дварчаніна, ГДГАМ, КП — 85095/5